# ДАЛЯГЛЯДЫ СУПРАЦОЎНІЦТВА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Што датычыцца міжнароднага парадку дня, Прэзідэнт Беларусі канстатаваў поўнае супадзенне поглядаў дзвюх краін. «Мы вас падтрымліваем у ААН па глабальным дакуменце — маніфесце, які вылучаны вамі. Тут абсалютна няма ніякіх пытанняў», — сказаў ён.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што цяпер вядуцца перагаворы па развіцці навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Казахстанам. «Думаю, мы прыйдзем да пагаднення да часу вашага візіту (у Беларусь. — **Заўвага БЕЛТА**), — дадаў беларускі лідар. — Вельмі шмат кірункаў, і мы гатовы з казахстанскім бокам працаваць».

У сваю чаргу Нурсултан Назарбаеў падкрэсліў, што паміж Беларуссю і Казахстанам склаліся блізкія саюзніцкія адносіны. Дзякуючы сумесным намаганням у апошнія гады створана шмат сумесных прадпрыемстваў.

Прэзідэнт Казахстана адзначыў, што, нягледзячы на зніжэнне тавараабароту ў фінансавым выражэнні, яго фізічныя аб'ёмы захаваліся. «Крызіс вечна не бывае, — упэўнены ён. — Цяпер мы вядзём работу па далейшым стратэгічным супрацоўніцтве».

Сёння Аляксандр Лукашэнка прыме ўдзел у пасяджэнні Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета. Перагаворы пройдуць у вузкім і пашыраным складах. На парадку дня пытанні паглыблення эканамічных адносін ЕАЭС з трэцімі краінамі і ключавымі інтэграцыйнымі аб'яднаннямі.

У ліку важных для Беларусі пытанняў канцэпцыі фарміравання ў ЕАЭС агульных рынкаў газу, нафты і нафтапрадуктаў.

Таксама будуць абмяркоўвацца асноўныя арыенціры макраэканамічнай палітыкі дзяржаў — членаў ЕАЭС на 2016—2017 гады, рэалізацыя асноўных кірункаў міжнароднай дзейнасці саюза.

# СЭНС СТРАТЭГІІ НЯЗМЕННЫ

## У ЯГО АСНОВЕ — КЛОПАТ ПРА ЧАЛАВЕКА




**Усебеларускі народны сход — рэальны механізм прамога ўдзелу народа ў кіраванні дзяржавай. Такое меркаванне выказаў старшыня Мінгарвыканкама Андрэй Шорац учора на гарадскім сходзе ўпаўнаважаных V Усебеларускага народнага сходу.**

Андрэй Шорац, падводзячы вынікі мінулай пяцігодкі, адзначыў, што зроблена «нямала добрага, і зроблена гэта сіламі людзей, якія побач з намі». Аднак у будучым пяцігоддзі яшчэ шмат чаго трэба рэалізаваць. Старшыня Мінгарвыканкама лічыць важным кожнаму беларусу, усяму беларускаму грамадству захаваць стабільнасць для далейшага дынамічнага развіцця. «Рэалізацыя ў новай пяцігодцы асноўных кірункаў сацыяльна-эканамічнага развіцця Мінска будзе садзейнічаць устойліваму эканамічнаму росту і выкананню галоўнай мэты — павышэнню якасці жыцця насельніцтва», — сказаў мэр сталіцы.

Звяртаючыся да ўдзельнікаў гарадскога сходу, ён адзначыў, што на Усебеларускім народным сходзе будуць вызначаны задачы дзяржаўнага будаўніцтва на бліжэйшую перспектыву. «Галоўны сэнс гэтай стратэгіі застанецца нязменным — клопат дзяржавы аб кожным чалавеку, які жыве ў Беларусі», — сказаў Андрэй Шорац. Ён выказаў упэўненасць, што дэлегаты ад Мінска годна прадставяць сталіцу і не толькі прымуць актыўны ўдзел у абмеркаванні праграмных дакументаў, але і ўнясуць уклад у яго рэалізацыю. «Выявіўшы мэтанакіраванасць, працавітасць, волю і цярпенне, мы дасягнем намечаных мэт», — рэзюмаваў старшыня Мінгарвыканкама.

Андрэй Шорац таксама падчас свайго выступлення заўважыў, што пашыралася сацыяльная інфраструктура сталіцы. «За апошнія пяць гадоў значна пашырылася сацыяльная інфраструктура сталіцы. Пабудавана 68 аб'ектаў аховы здароўя, 18 аб'ектаў фізкультурна-аздараўленчага і спартыўнага прызначэння», — сказаў мэр сталіцы. Паводле яго ацэнкі, за пяцігоддзе сістэма аховы здароўя сталіцы дасягнула станоўчых вынікаў практычна па ўсіх аспектах дзейнасці. «Узровень дзіцячай смяротнасці адпавядае ўзроўню ў такіх краінах, як ЗША, Германія, Японія, Швецыя, Нарвегія. Зніжана смяротнасць мінчан ва ўсіх узроставых катэгорыях. Павялічылася да 75,5 года чаканая працягласць жыцця мінчан», — інфармаваў Андрэй Шорац.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**

■ Без тытуню

# КУРЫЦЬ — НЕ ГЛАМУРНА!

## Сёння можаце паспрабаваць кінуць курыць — кажуць, у гэты дзень лепш атрымліваецца

**Сёлета ўсе краіны свету звяртаюць увагу на ўпакоўку тытунёвых вырабаў. Новыя патрабаванні да ўпакоўкі і маркіроўкі ў адпаведнасці з патрабаваннямі міжнародных нормаў установлены ў тэхнічным рэгламенце і Мытнага саюза. Дакумент днямі ўступіў у сілу.**



Гэта абавязвае ў тым ліку айчынную тытунёвую прамысловасць выпускаць цыгарэты з папярэджаннямі аб шкодзе курэння ў выглядзе выявы і тэксту плошчай 50 працэнтаў кожнага з вялікіх бакоў пачкі. Эскізы ўжо зацверджаны. Пакуль папярэджванні на пачку тытунёвых вырабаў займаюць 30 працэнтаў і не змяшчаюць карцінак. Увадзіцца абавязковае нанясенне на ўпакоўку інфармацыі аб змяшчэнні канцэрагенных і мутагенных рэчываў. Не дапускаецца пры гэтым указанне колькасці смалы, нікаціну і монааксіду вугляроду ў дыме, што можа ўводзіць у зман адносна большай ці меншай шкоды. Не пазней як праз год пасля апублікавання такога рашэння папярэджванні з'явяцца на пачках цыгарэт ва ўсіх краінах ЕАЭС.

«Новы стандарт упакоўкі, на якой толькі чорны і белы колеры, ужо некалькі гадоў дзейнічае ў Аўстраліі, чый станоўчы вопыт быў вывучаны перад тым, як распаўсюдзіць на іншыя краіны, — адзначае **кіраўнік Краінавага бюро СААЗ у Рэспубліцы Беларусь Ягор ЗАЙЦАЎ**. — Гэта прыбірае гламур з тытуню — зніжае прывабнасць такіх вырабаў, а ў цэлым зніжае попыт на іх».

Сёння ў адной з залаў чакання мінскага чыгуначнага вакзала з 11.00 да 15.00 пройдзе акцыя, падчас якой можна будзе прайсці тэст — даведацца па аналізе сліны аб генетычнай схільнасці да нікацінавай залежнасці, верагоднасці развіцця звязаных са шкоднай звычкай анкалагічных захворванняў. Усе ахвотныя змогуць атрымаць прафесійную кансультацыю па пераадоленні залежнасці.

Курэнне правакуе 90 працэнтаў смерцяў ад раку лёгкага, хранічнага бранхіту і ішэмічнай хваробы сэрца. З курэннем звязваецца і рост захворванняў, якія прыводзяць да інваліднасці: ішэмічнай хваробы сэрца, туберкулёзу, эмфіземы і раку лёгкага, астматычных бранхітаў, язвавай хваробы страўніка і дванаццаціперснай кішкі, хвароб нервовай сістэмы і іншых.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

■ Надвор'е

# МАКСІМУМ СОНЦА

## Спецыялісты абяцаюць, што крыху пасвяжэе толькі на выхадныя

**Практычна з першых дзён каляндарнага лета ў нашай краіне ўсталюецца цёплае надвор'е, паведамляе начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Дзмітрый РАБАЎ.**

Характар надвор'я будзе вызначаць Скандынаўскі антыцыклон, толькі па паўднёвым захадзе чакаецца ўплыў атмасферных франтоў». Таму ў аўторак толькі ўдзень пераважна па паўднёва-заходняй палове краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, месцамі па Брэсцкай вобласці моцныя дажджы. У асобных раёнах краіны навальніцы. Удзень месцамі ўзмацненне ветру з парывамі да 15-18 м/с. Максімальная тэмпература паветра будзе дасягаць 22—28 цяпла.

А вось з серады і да пятніцы ўключна, чакаецца пераважна без ападкаў, толькі па паўднёвым захадзе краіны магчымы кароткачасовыя дажджы, месцамі навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе ад 10 да 17 цяпла, удзень будзе плюс 19—26 градусаў.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных спецыялістаў, у выхадныя дні на тэрыторыю Беларусі завітаюць атмасферныя франты з боку паўночнага захаду і стане больш воблачнасці і дажджоў. У суботу ўначы па паўночным захадзе, а ўдзень — месцамі кароткачасовыя дажджы і навальніцы.



Тэмпература паветра ўначы будзе плюс 7—14 градусаў, а ўдзень — плюс 18—25 градусаў. Пасвяжэе толькі ў нядзелю, калі ўначы месцамі, а ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах магчымы навальніцы. Мінімальная тэмпература паветра ўначы складзе ад 7 да 14 цяпла, а максімальная ўдзень — плюс 16—23 градусы.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

## Беларуская гуманітарная дапамога адправілася ў Эквадор

**У красавіку ў гэтай паўднёваамерыканскай краіне адбыўся магутны землятрус магнітудай 7.8 бала. Падземныя штуршкі забралі 660 жыццяў, больш за 50 тысяч чалавек атрымалі раненні. Стыхія пакінула без даху над галавой сотні тысяч людзей.**

— Таму было прынята рашэнне аказаць Эквадору гуманітарную дапамогу, — паведаміў «Звяздзе» **прэс-сакратар Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Віталь НАВІЦКІ.** — Мы ўзгаднілі з тамтэйшым бокам спіс неабходных рэчаў. Гэта тавары першай неабходнасці — коўдры, палаткі, дызельныя перасовачныя электрастанцыі, ложкі. Агульны кошт грузу вагой 50 тон складае каля 6 мільярдаў беларускіх рублёў. Яго даставяць транспартным самалётам у горад Манта на ціхаакіянскім узбярэжжы Эквадора: гэты населены пункт вельмі моцна пацярпеў ад падземных штуршкоў.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК**

■ Гарызонты

# СЁННЯ МАРЫЦЕ — ЗАЎТРА РОБІЦЕ

**Студэнтка IV курса Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта Марыя Бандарчук будзе прадстаўляць нашу краіну на міжнародным конкурсе «Мост кітайскай мовы». Дзяўчына стала лепшай на нацыянальным адборы, які прайшоў на днях у Мінску.**

Перш за ўсё канкурсанты здавалі пісьмовы экзамен. І толькі 13 з іх былі допушчаны менавіта да самога спаборніцтва. Яно праходзіла ў некалькі этапаў. Для пачатку ўдзельнікі адказалі на пытанні па гісторыі, геаграфіі і культуры Кітая. Другі крок — выступленні з вусным паведамленнем па тэме сёлетняга конкурсу «Мара асвятляе будучыню». Акрамя гэтага быў і этап на імправізацыю: студэнты павінны былі коратка выказаць сваё меркаванне па прапанаванай тэме. Завяршалі конкурсны дзень творчыя нумары. Тут можна было падзівіцца і на тэатр ценяў, і на прыгожыя спевы, і на гумарыстычныя сцэнкі.

«Мост кітайскай мовы» праводзіцца ўжо 15-ы раз. За гэты час беларуска-кітайскае супрацоўніцтва перарасло ў маштабнае стратэгічнае партнёрства. У тым ліку, пашыралася ўзаемадзеянне і ў сферы культурнага абмену. Першы сакратар па справах адукацыі Пасольства КНР у Беларусі Ван Дацзюнь адзначыў на адкрыцці, чаму так важна якасна рыхтаваць маладых спецыялістаў:

— Мы жадаем даць сённяшнім канкурсантам магчымасць працаўладкавацца. Мы запрасілі прадстаўнікоў кітайскіх прадпрыемстваў, каб яны маглі заўважыць будучых зорак. Нам трэба падрыхтаваць сваіх спецыялістаў па пытаннях эканамічнага і палітычнага беларуска-кітайскага супрацоўніцтва, якія будуць запатрабаваны. І мы павінны падрыхтаваць больш кваліфікаваных перакладчыкаў для будучых сумесных прадпрыемстваў. Каб дамагчыся гэтага, трэба старанна працаваць.

**Надзея АНІСОВІЧ.**

■ Трагедыя

# НА ДАЧЫ ЗАГІНУЛА ДЗІЦЯ

**Страшнае здарэнне адбылося на дачным участку аднаго з садовых таварыстваў Баранавіцкага раёна, — расказала афіцыйны прадстаўнік Брэсцкага абласнога ўпраўлення Следчага камітэта Марына ДРАНЬКОВА.**

У мінулую суботу а сёмай гадзіне вечара загінула 10-гадовая дзяўчынка. Школьніца разам з бацькамі і малодшым братам прыехала ў госці з Мастоў Гродзенскай вобласці. Сям'я скарысталася запрашэннем сяброў і адпачывала разам з гаспадарамі на іх дачным участку. Пакуль маці займалася малодшым сынам, бацька дзяўчынкі праводзіў час з сябрамі. У нейкі момант мужчына прытуліўся да слупа, які ўстанавілі перад домам для ўзвядзення навеса. Канструкцыя аказалася нетрывалай, слуп аддзяліўся ад кладкі і стаў падаць на дзяўчынку, якая стаяла побач.

Хуткая дапамога прыбыла па выкліку за мінуты. Бацькі яшчэ спадзяваліся на цуд, але медыкі вымушаны былі канстатаваць смерць. Дзіця атрымала траўмы галавы не сумяшчальныя з жыццём.

Марына Дранькова дадала, што па факце гібелі дзяўчынкі праводзяцца ўсе неабходныя праверкі. Следчыя Баранавіцкага СК высвятляюць законнасць пабудовы названых канструкцый і захаванне правілаў іх узвядзення. Прызначана судова-медыцынская экспертыза.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

**Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь смуткуе ў сувязі са смерцю дырэктара Выдавецкага дома «Вечерний Гомель-Медиа», галоўнага рэдактара газеты «Новый Вечерний Гомель» КАНАВАЛЕНКІ Аляксея Уладзіміравіча і выказвае глыбокія спачуванні яго родным і блізкім.**

**РВУ «Выдавецкі дом «Звязда» смуткуе ў сувязі з заўчаснай смерцю свайго калегі, дырэктара Выдавецкага дома «Вечерний Гомель-Медиа», галоўнага рэдактара газеты «Новый Вечерний Гомель» Аляксея КАНАВАЛЕНКІ і выказвае глыбокія спачуванні яго родным і блізкім.**